Н. Ф. Гікало

# Павярнуць партыйныя, совецкія грамадскія арганізацыі БССР тварам да плана

*(З выступлення на 1-м Усебеларускім з'ездзе райпланаў)*

Аб значэнні нашага совецкага большэвіцкага плана на даным з'ездзе планавікоў, я думаю, гаварыць не прыходзіцца.

Я не буду гаварыць адносна таго, якое значэнне мае наш план у агульнай нашай бягучай, практычнай, крапатлівай рабоце па справе будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне, бо кожны з вас, хто непасрэдна працуе над планам, ведае, што існаванне самога плана, магчымасці планавання ляжаць у соцыялістычным характары ўсёй нашай сістэмы.

І тым не менш пэўная недаацэнка планавай работы ў радзе месц яшчэ існуе. Цэлы рад арганізацый, партыйных, совецкіх, прафесіянальных і т. д. лічаць, што на планавую работу асаблівай увагі звяртаць не варта. Калі план складаецца, калі вызначаецца, колькі дадуць раёну, чаго дадуць, чаго не дадуць, тут яшчэ цікавяцца планавай работай, а ў астатні час году планавай работы як-бы не існуе і таму, калі трэба правесці кампанію па загатоўцы, кампанію па вывазцы дроў—кажуць: давай пашлем планавіка, бо ўсёроўна яму рабіць няма чаго *(смех)*.

З другога боку, некаторыя таварышы, непасрэдна працуючыя над планам, уяўляюць сабе гэтую работу ў выглядзе суцэльнага патоку лічбаў, статыстычных табліц і дакладных запісак. Гэта значыць засесці, абкласці сябе матэрыяламі і лічбамі, якія складзены так, што ў іх можа разабрацца толькі адзін планавік. А ў рэзультаце такой адарванай ад жыцця „творчасці“, калі задасі пытанне планавіку—колькі-ж рагатай жывёлы ў вас у раёне—ён не ведае.

Безумоўна, я некалькі ўтрырую, завастраю пытанне, але зусім відавочна, ёсць два тыпы адносін да пытання планавай работы: з аднаго боку, лічаць, што планавая работа абмяжоўваецца толькі перыядам складання плана, а ў астатні час году няма чаго рабіць планавікам—і таму можна планавых работнікаў перакідаць на

якія хочаш работы, а з другога—асобныя планавікі лічаць, што планавая работа—гэта „чыстая“ творчасць „чыстай“ статыстыкі і, калі ласка, нас не чапайце, нікуды не пасылайце.

Я думаю, што не трэба даказваць, што ні той, ні другі падыход да планавай работы нікуды не варты *(апладысменты)*.

На пленуме ЦК партыі мне давялося атрымаць лічбы ад аддзела працы ЦСПСБ, запатрабаваныя ім ад прадпрыемстваў адносна снабжэння, зарплаты і т. д. Калі я разгарнуў табліцу, дык здзівіўся, я вас запэўніваю, яна была даўжынёю ад трыбуны больш чым да сярэдзіны зала *(смех)*.

План выходзіць з рэальнага жыцця, задач, напрамку, які камуністычная партыя дае развіццю народнай гаспадаркі, і не можа быць падменены бяссэнсавым награмаджаннем лічбаў. Зразумелая справа, калі мы да плана аднясемся з усёй сур'ёзнасцю, дык павінны будзем падумаць і аб другім боку планавай работы—аб сістэматычным кантролі за ходам выканання плана, забеспячэнні яго бясспрэчнага і поўнага выканання.

План у цэлым цяжка кожны раз праверыць, але ў рашаючых частках мы яго сістэматычна правяраем. І вось, правяраючы план у раёне, скажам, у Тураўскім (кажуць, што Тураўскі раён прадставіў адзін з лепшых планаў народнай гаспадаркі на 1934 г.—гэта добра), мы прад'яўляем патрабаванні, каб план быў выкананы. Калі-ж ён не выкананы, дык мы ў ЦК выясняем, хто вінаваты ў невыкананні і, у першую чаргу, прад'яўляем патрабаванні да райвыканкома, райкома і тых асоб, якія сядзелі і працавалі над выкананнем той ці іншай часткі плана ў раёне. І вы ведаеце, што мы ў пытанні барацьбы за план, за яго практычнае ажыццяўленне прад'яўляем рахунак вельмі моцны і караем вельмі моцна. Вы ведаеце, што мы РК і РВК, а гэта значыць людзей, якія там працуюць, б'ем за невыкананне плана. Значыць, для кожнага з раённых работнікаў, тым больш для ўсіх нас, зусім відавочным з'яўляецца важнасць і значымасць плана не толькі ў эканамічных, але і ў палітычных адносінах. Між тым, нам вядома, што планавая справа на месцах у цэнтральных арганізацыях, у рэспубліканскіх арганізацыях значна недаацэньваецца.

Мы ведаем, што да гэтага часу адносіны да пытання аб плане былі самыя недапушчальныя. І сапраўды, калі так па сумленнаму гаварыць, а вы, планавікі, безумоўна, наконт сумленнасці разумееце *(смех)*, дык вось па сумленнаму кажучы, трэба проста сказаць, што плана, хоць-бы прыкладна такога, як сёння, у нас не было ні ў 1932 г., ні ў 1933 г. Гэта не толькі таму, што не было людзей, якія маглі скласці план. Гэта таму, па-першае, што адносіны да плана былі недапушчальныя. І вось у рэзультаце такіх адносін да плана мы бачым адсутнасць планавай дысцыпліны ў выдаткаванні сродкаў, матэрыялаў ды інш. У 1932 і 1933 гг. раёншчыкі і па партыйнай і па савецкай лініі планам не займаліся. Потым, калі атрымліваўся прарыў, гаварылі, мы ў плане ўдзелу не прымалі. Здаралася, напрыклад, што ў раёне не прадугледзілі, што дамба ўвесну прарвецца і вада залье мястэчка, а для гэтага патрабуецца 100 тыс. руб. Чаму не прадугледзілі? Таму, што думалі—усёроўна СНК і ЦК сродкі адпусцяць. Навош-

та-ж план складаць? А калі здарыўся прарыў, бягуць і кажуць: „дайце 100 тыс. руб., падумаеш 100 тыс. руб.—вялікая справа“. Мы, у сваю чаргу, у большасці выпадкаў рашучага адпору такім настроям не давалі.

Гэта сістэма недысцыплінаванасці, нежаданне непакоіцца за кожную капейку, гэтыя настроі даволі моцна адчуваліся не толькі ў раёнах, але і ў нашых наркаматах. Прыкладаў можна прывесці колькі хочаш. Выжыць такое становішча нам трэба з усёй рашучасцю, а гэта значыць заставіць людзей сур'ёзна займацца складаннем плана і барацьбою за выкананне яго *(апладысменты)*. План 1934 г. мы абмяркоўвалі не адзін раз у савецкіх, гаспадарчых арганізацыях, па лініі партыйнай. Апошнія абмеркаванні планаў паказваюць, што ў адрозненне ад планаў мінулых гадоў, калі не заўсёды правільна праектавалі, з прычыны чаго бывалі буйныя разбежкі, план 1934 г. у асноўным складзен правільна. Калі наш план праходзіў у Маскве, дык ён атрымаў нядрэнную ацэнку з боку работнікаў саюзнага Дзяржплана. Апрача таго, мы ў гэтым годзе маем планы раёнаў. Гэта галоўнае і рашаючае. Раней з года ў год мы раённага плана не мелі. Мы мелі бюджэтныя наметкі, планы па некаторых галінах і т. д., але народнагаспадарчага плана ва ўсіх яго напрамках у раёне мы не мелі. У гэтым годзе па ўсіх 75 раёнах мы такі план маем. Няхай ён будзе яшчэ не зусім здавальняючым, бо магчыма, што ў некаторых раёнах чаго-небудзь не ўлічылі, не вывучылі, але выходнае, адпраўное ў плане раёнаў на 1934 г. ужо ёсць.

Што патрэбна для таго, каб гэтую работу ўзняць? Патрэбна было, безумоўна, прарабіць велізарную арганізатарскую работу і тут трэба аддаць справядлівасць цяперашняму кіраўніцтву Дзяржплана.

Я памятаю ў 1932 г. гаварылі: „У нас Дзяржплана няма, ну што гэта за Дзяржплан, старшыня Дзяржплана не камандуе, распараджэнняў не дае, становішча такое, што хоць уцякай з Дзяржплана. Няма рукі“.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі***